Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул. 12, п. 6.** (Wileńska 12, m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад **12** да **2** г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад **9** да **3** г.

Падпіска на **адзін месяц** з дастаўкай да хаты **2 зл.** Для заграніцы ўдвая даражэй.

ІСКРА

Выходзіць тры разы у тыдзень.

Перамена адрэса 30 грошы.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукована га залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп.

№. 3. Вільня, Нядзеля, 14-га чэрвеня 1925 г. Год I.

„Дары“ крэсам.

Ніжэй мы зьмяшчаем зацьверджаныя Радай Міністраў пастановы тэй самай „крэсавай сэкцыі“ палітычнага камітэту Рады Міністраў, якая толькі—з уходам п. Тугутта — асталася без галавы...

Можна думаць, што гэтыя 20 пунктаў, якія пералічывае афіцыяльнае паведамленьне Рады Міністраў, зьяўляецца часткай тэй праграмы, тых „54 пунктаў“ крэсавай рэфармацыі, як казаў у сваім „тэстаманце“ п. Тугутт.

Трэба было, відаць, неяк паказаць краю, а перад усім — заграніцай, што зрабіўшы наагул вельмі дрэннае для ўраду ўражаньне ўход п. Тугутта—дый яшчэ з гэткім бразгам дзьвярыма! — зусім ня спыніў дабрадзейную і апякунчую працу ўраду, скіраваную ахвярна на карысьць „Крэсаў“, што гэтая праца йдзе ўсьцяж, мо' навет яшчэ ляпей,—у адсутнасьці Тугутта, абы толькі быў у „сэкцыі“ яе запраўдны галава і кіраўнік п. Ст. Грабскі.

Вось, дзеля чаго, зразумела, урад абодвух братоў і пасьпяшыў выпусьціць свой „крэсавы маніфэст“, налічыўшы ў ім шмат „пунктаў“, а даўшы ў запраўднасьці вельмі мала.

Пасьлядзім-жа, што-ж даў урад „Крэсам“.

Перад усім найцікаўней — бо сымвалічна! — на першае мейсца ўсей „крэсавай“ справы урад высунуў—асадніка.

Польскі асаднік, але не беларускі ці ўкраінскі селянін, вось,—запраўдны і прывілеяваны аб'ект урадовых клапотаў апекі на „Крэсах“, запраўдны, калі ня выключны, суб'ект „зямельнай рэформы“ на беларускіх і ўкраінскіх абшарах.

Першы пункт „маніфэсту“ і кажа аб тым, каб замацаваць правы асадніка на землю на „Крэсах“, пункт другі, кажучы аб зямельных „патрэбах мясцовага насяленьня“, перад усім зусім ня кажа, што гэта за мясцовае насяленьне. Гэтым мясцовым насяленьнем лёгка можа аказацца ўся тая новая „фальваречная служба“, якую цяпер польскія абшарнікі масава выпісываюць з „крулеўства“ дый з „малапольскі“—на замен тутэйшых беларусаў ці ўкраінцаў.

Але, гэты пункт ня мае навет ніякага юрыдычнага зьместу, бо загад „шырока і заботліва трактаваць патрэбы“ і г. д., мае чыста „маральны“ зусім ня выразны характар. Дык ня толькі не дае нічога, але нічога ясна і азначана не абяцуе. Трэці пункт аграрнай часткі „маніфэсту“ кажа аб камасацыі, да якой неяк з боку, як драбніца, на якой навет урад ня спыняецца даўжэй, як „дадатак“, прылучаюцца прырэзкі... Якія гэта маюць прырэзкі да „карлавых“ галодных гаспадарак менш $^1/_2$ гэктара, можа, не вялікшыя за гэтых „карлаў“,—аб гэтай драбніцы ўрад навет ня лічыць патрэбным спыніцца. — Гэта-ж не асаднікі!..

Далейшыя пункты кажуць аб пасьпешнай ліквідацыі сэрвітутаў, якая, зразумела, патрэбна і карысна панам-зямляўласьнікам, а зусім не сялянству; дый зробіцца яна—з падвойнай крыўдай для апошняго, і аб палепшаньні зямель, асушэньні балот... Ну, аб гэтым маніфэст кажа толькі слова, бо на запраўднае шырока-пастаўленае дзела перад усім ня мае грошаў... І гэтыя дробныя крэдыты, калі навет знойдуцца, дык пойдуць на палепшаньне панскіх зямель, якія пасьля толькі селянін-хлебароб будзе даражэй купляць праз той „Банк Рольны“, які мае пашырыць сваю дзеяльнасьць (вельмі слабую ў цэнтральнай Польшчы) і на абшары Крэсаў, аб тым кажа апошні „аграрны“ пункт „Маніфэсту“.

Што-ж сказаць аб пунктах, датычучых школы і асьветы.

Дзіўна перад усім, што—пасьля выданьня закону аб мовах у школах на „Крэсах“, закону, які праз месяц будзе спаўняць першыя ўгодкі сваіх народзін, патрэбавалась ня толькі, так сказаць, першае (навет 2 „першых“) звычайнае „выканаўчае распараджэньне“ да яго ўвядзеньня ў жыцьцё, але цяпер — і другое—надзвычайнае — у парадку амаль ня „Маніфэсту“...

Але яшчэ дзіўней, калі не агідней, што як першае, так і гэнае цяперашняе, ня толькі ня выконываюць закону, бы ён крыўдны ня быў, але ў значнай меры спыняюць, касуюць тое, што пастаноўлена ўсімі Законадаўчымі ўстановамі Рэспублікі.

Бо, паводле закону 31 ліпня, павінны адчыняцца чыста беларускія школы там, дзе ёсьць патрэбная лічба жадаючых гэтага бацькоў, а няма 25 польскіх дзяцей.

А вось маніфэст Тугуттаўскага „душапрыкашчыка—п. міністра Ст. Грабскага загадывае тварыць толькі і выключна „двуязычныя“ —польска-беларускія школы...

— Гэтыя „двуязычныя школы“ будуць, як лёгка прадбачыць, мейсцам заўседных зьдзекаваньняў над беларускай мовай — над душой беларускага дзіцяці, местам таго, што ў расейскай пэдагагічнай літэратуры даўно акрэсьлена трафным словам: „школьная інквізыцыя“... Рэшта школьных пунктаў—паўтарае яшчэ раз (забыліся ўжо ў каторы!..) абяцані п. міністраў—аб „курсах“, „падручніках“ і г. д.

Але аж дрож бярэ, калі падумаеш, што ўсе гэтыя атручаныя „дары“ беларускаму народу будуць ісьці праз такога заядлага — „данайца“, такога—„духоўнага правадыра“, як мін. Ст. Грабскі, які, відаць, хоча моцна захапіць ініцыятыву „асьветнай“ працы на „Крэсах“—у сваі шчэпкія і бязлітасныя рукі...

Прамовы паслоў Тарашкевіча і Ярэміча.

Паседжаньне Сойму 10 чэрвеня 1925 г.

Маршалак ... Пераходзім да пасьпешных унёскаў.

Перш, чым даць слова паслом, што запісаліся да матываваньня пасьпешнасьці, хачу зрабіць колькі ўвагаў і скіраваць да Вас, паны, адзін прызыў. Гэты прызыў патрэбны таму, што не заўважыў сформулованых напісаў аднаго і другога ўнёску. Вядзецца блізка за правіла, а ў кожным разе дзеецца нязьмерана часта, што ў інтэрпэляцыях ці ўнёсках пасьпешных і непасьпешных у загалоўках знаходзяцца вельмі дражлівыя і драстычныя азначэньні некаторых фактаў, якія бязумоўна заслугоўваюць на такі асуд, калі акажуцца праўдзівымі і сьцверджанымі. Ня маю намеру пярэчыць, што гэтыя факты быццам не праўдзівыя, аднак жа думаю, што лепш адлажыць гэтакі прысуд да таго мамэнту, калі будзем чуць аб дадзеным факце са стараны на тое пастаўленай, гата зн. са стараны ўраду. Я-б вельмі Вас прасіў, паны, з огляду на павагу Сойму і з огляду на канешнасьць захаваць пэўную бесстароннасьць, каб Вы прытарнаваліся да гэтага. Кірую гэта, як прызыў—просьбу... Да пункту 15: пасьпешнасьць унёску паслоў беларускага клюбу, у справе бандыцкага нападу асаднікаў на пасла Ярэміча. Слова мае пасол Тарашкевіч...

Тарашкевіч. Высокая Палата! Загаловак у гэтым пасьпешным унёску — прызнаюся — вельмі дражлівы, але толькі таму, што самая справа яшчэ больш дражлівая. Аднак-жа, паны, каб не раздражніць Вас на самым пачатку, я папрашу Вас прадставіць сабе тое здарэньне з 1922 г., якое дзеілася ў Пазнані, калі на пасла Вітаса з прычыны партыйнае калатні зроблены падобны-ж бандыцкі напад. Ведама-ж, быў пададзены пасьпешны ўнёсак і яго пасьпешнасьць бараніў тады пасол Ратай, чалавек, які дасканальна знае польскую мову, чалавек, які бязумоўна, мае вялікую хілкасьць мысьлі і йшчэ вялікшую лёгкасьць яе выращэньня... І вось даслоўна, што казаў тады гэты адточаны стыліст:

„На веча гэтае прыбыла банда, узброеная палкамі. Правадыром гэтае банды быў паміж іншым адзін з паслоў так званае Хрысьціянскае дэмократыі. І вось, калі тыя грамадзяне (Вітас і яго прыяцелі) выхадзілі з трактыеру з пераконаньнем, што староста і начальнік паліцыі споўняць— перапрашаю за выражэньне — свой сабачы абавязак, то з брамы на воку паліцыі выляцела банда і кінулася на сядаючыя ў аўтамабіль“.

І вось сказана, на чале банды быў пасол з хадэцыі, а вы, паны, маўчалі... Напалі на паслоў, калі тыя выходзілі з трактыеру а, ёсьць ведама, пры трактыерах розныя рэчы бываюць... Тымчасам тут зроблены напад на паслоў, калі тыя спаўнялі свой пасольскі абавязак, прадугледжаны конституцыяй, здавалі праваздачу з работы ў Сойме. Тады іменна напала банда вайсковых асаднікаў заарганізаваных як гэта выясьняецца, ўладай „bezpieczeństwa“. Цяпер ёсьць вестка аб тым, што напярэдадні гэтага здарэньня ў старостве адбыўся сход у прысутнасьці пружанскага старасты, ягонага заступніка і асаднікаў і на гэтым-жа вечы на прапазыцыю старасты быў кінуты лёс, хто мае ўдэрыць беларускага пасла. Здарыўся-ж гэты напад у варунках, калі а падражненьні каго колечы пасолом Ярэмічам не магло быць і мовы, бо калі пасол ішоў на трыбуну, то зараз-жа зводдаль пачала страляць паліцыя, каб вытварыць замяшаньне; пасол зыйшоў з трыбуны супакоіць народ, а тымчасам банда асаднікаў, прыведзеных на маіх вачох пад самую трыбуну паліцейскім, напала на пасла і пачала яго біць. Паліцыя была бясчыннай аж да мамэнту, пакуль ня трэба было бараніць нападаўшых ад узбуранага натоўпу; толькі тады паліцыя паказала, што яна ўмее.

Так было ў Пружанах... А што-ж было далей у Сойме. Калі я выступіў бараніць тую законнасьць, аб якой вы, паны, так часта кажаце, тады вы, не даючы мне гаварыць, не даючы называць рэчаў іх уласным іменем, тады вы пакрылі гэтае шальмоўства.

Дык вось сёньня стаўлю вас перад адным з двох: альбо, галасуючы за пасьпешнасьцю ўнёску, станаць на старане хоць бы прызваітасьці, альбо, галасуючы проці гэтага ўнёску, станаць яшчэ адзін раз па старане бясправўя і шальмоўства. Прасіці ня буду: вашае дзела выбраць — дык выбірайце!..

Маршалак. Паны паслы, хто за сьпешнасьцю ўнёску беларускага клюбу прашу ўстаць. (Усе направа ад „Вызваленьня“—сядзяць). Стаіць меншасьць. Пасьпешнасьць унёску адкінута. (Крыкі і шум зьлева. Маршалак звоніць). Унёсак ідзе да адміністрацыйнай камісіі.

Прыступаем да 16 пункту парадку дня. Пасьпешнасьць унёску паслоў беларускага клюбу ў справе забойства Антона Вайтовіча, дзікага катаваньня вучыцеля Беганскага і іншых сялян, учыненага пагранічнай стражай і вывядоўцамі.

Для абароны пасьпешнасьці мае слова пасол Ярэміч.

Ярэміч. Высокая Палата! Тыдні со два таму назад пры разглядзе бюджэту Міністэрства Унутраных Спраў я падымаў справу аб забойстве Вайтовіча, а гэта дзеля таго, што наш пасьпешны

ўнёсак ня мог ніякім спосабам трапіць на парадак дня поўнага збору Сойму.

Вяртаючыся да справы, хачу сказаць колькі слоў аб гэтым ганебным чыне, аб гэтым ганебным забойстве Вайтовіча, якому задалі 35 ран, з якога, жывога чалавека, вытачылі кроў і толькі ўначы быў устрывожаны афіцэр 10 баону наглаю сьмерцю Вайтовіча. Спраўдзілі гэта сэкцыяй нябожчыка, а далей адчытаю яшчэ адказ Міністэрства. У гэтым самым 10 баоне Беганскага і ягоную сястру катавалі бэстыяльскім спосабам, забівалі пад ногці шпількі, так што іх зрывалі. (Шум). Тады, калі я казаў аб гэтым з трыбуны, мне крычалі: „А мы гэта спраўдзім, а калі гэта акажацца няпраўдай, то п. Ярэміча пацягнем да адказнасьці“. Але вось неяк ніхто не паказаўся, ніхто не пашоў, ня спраўдзіў. А калі вы тады абвінялі мяне ў ілжы, то вось цяпер я прычытаю адказ Міністэрства Ўнутраные Спраў. (Чытае).

„Варшава, дня 2 мая 1925 г. Сільвэстра Беганскі і ягоная сястра Надзея былі арыштаваны дня 23 сьнежня 1924 г., як сільна западазроныя ў арганізацыі на абшары Віленскага павету дывэрсыйных бандаў і камуністычнай работы. Запраўды сьледзтва, праведзенае ў справе Беганскага, пацьвярдзіла, што Сільвэстра Бегачскі ў часе быцьця ў арышце быў паддаваны біцьцю і зьдзекам, дакананым тайнікамі Х-га баону Ахраны Пагранічча. Тайнікі гэтыя, іменна Малікоўскі і Занехоўскі ня ёсьць урадоўцы дзяржаўныя, а цывільныя асобы.

Затое сьледзтва, праведзенае ў гэтай справе следавацелем віленскага павету, ня выявіла якіх-колечы фактаў біцьця і зьдзекаў, а тым больш якога гвалту над асобаю арыштаванае сястры Беганскага, якая на дапыце ў сьледавацеля ні на што ня скардзілася.

Памёршы Антон Вайтовіч згодна з сабранымі шляхам дасьледу верагодных даных браў чыннае ўчасьце ў бандыцкім нападзе дня 10 студня г. г. на дом Яна Куніцкага ў Сыцэвічах, Вялейскага павету (*пасол Станьчык: дык за гэта яго забіваюць, а ня судзяць*!).

Роля Вайтовіча ў гэтым нападзе была такая, што вартаваў пад вакном у той час, калі іншыя бандыты рабавалі. На падставе гэтых дадзеных Антон Вайтовіч загадам афіцэра разьведчыка Х-га баону паручніка Вардзынскага быў арыштаваны („pzytzymany“) 20 студня г. г. у 7 гадзін раніцы і дастаўлены ў 16 гадзін таго-ж дня ў Краснае дзеля дапыту. У 24 гадзіны ўначы доктар кап. Гіцкевіч быў устрываж аны неспадзеванаю сьмерцю Вайтовіча. Доктарскія аглядзіны і сэкцыя цела ўстанавілі, што ён памёр ад пабіцьця ў Красным.

Ярэміч чытае міністэрскае пісьмо й далей, дзе міністар напірае на тое, што афіцэры ня білі, а толькі „цывільныя асобы“—тайнікі Маліковскі і Замеховскі, што тайнікі аддадзены пад суд, што ў гэтай справе вядзецца следзтва, што афіцэры—вывядоўцы Ахраны пагранічча-вельмі добрыя служакі і лагодныя людзі, што наагул выпадкі біцьця гэта толькі выняткі, а ніякай сыстэмы ў гэтым няма і г. д.

Маршалак прыпамінае, што ўжо даўно час скончыць.

Ярэміч. Яшчэ пара слоў толькі. Дык вось, паны, з аднаго боку, калі ў Лодзі Энгель забіў тайніка, то яго палічылі за ўрадоўца і Энгеля засудзілі на сьмерць. З другога-ж боку, калі забілі Вайтовіча, то пан Міністар кажа, што яго забіў не ўрадовец, а толькі нейкая цывільная асоба! Вось-жа я пытаюся, хто гэтыя тайнікі — канфідэнты ў Польшчы, ці гэта бандыты, што забіваюць людзей і дастаюць за гэта пэнсію, ці гэта—дзяржаўныя ўрадоўцы. Хай-жа пан міністар хоць раз нам скажа. Я, можа, не казаў-бы а пасьпешнасьці гэтага ўнёсак, каб не паўтараліся-б падобныя здарэньні ўсё часьцей. Нядаўна ў маі...

Маршалак. Пане пасол, ня можаце даўжэй гаварыць, мусіце канчыць!

Ярэміч. Дык вось, Высокая Палата, прашу прыняць пасьпешнасьць і выбраць камісію з 10 сябраў, каб разабраць справу на месцы.

Сэйм адлажыў галасаваньне над гэтаю справаю да наступнага паседжаньня, дамагаючыся ад міністра выясненьня гэтае справы з соймавае трыбуны.

Тое, што пан міністар піша выходзіць так: каб я, каб каму, каб калі, каб дзе, каб што, каб якое, а то-ж—нікому, ніколі, нігдзе, нічога ніякага... а калі што якое—дык што-ж так такое!!

Выйшаў з друку і прадаецца
ў Вільні — Белар. кнігарня Завальная 7

№ 4 (5)

„Студэнскай Думкі“.

ПАДПІСКА ПРЫЙМАЕЦЦА:

На квартал 3 зл. — Асобны нумар 1 зл.

Жадаючыя могуць выпісываць камплекты—з № 1-га па апошні.

Адрэс рэдакцыі: Вільня, Віленская 12—6.

Інтэрпэляцыі Беларускага Пасольскага Клюбу.

№ 240—Паслоў Беларускага Клюбу да п. Міністра Справядлівасьці — у справе забойства жаўнерамі гранічнай стражы солтыса (старасты) в. Брыкоўшчына, Ланьскай гміны, Нясьвіжскага пав.

Перад Пасхай гэт. году. Сяляне в. Брыкоўшчыны, Ланьскай гміны, Нясьвіжскага павету — Лаўрэн Лях, Адам Лях і Юльян Шэстак капцілі па над тлеючым агнем каля хатаў шынкі — каля 9 гадзіне вечара. Два з іх былі пры агні, трэці рубаў паленьні. У той час надыйшоў патруль, які скамандаваў: „рукі—у гару, на зямлю!“

Сяляне споўнілі загад каманды, але жаўнеры пачалі страляніну з карабінаў па ляжачых людзях—у адлежнасьці некалькі дзесяткаў крокаў.

У часе гэтай страляніны быў сьмяротна ранены 3 кулямі солтыс Ляўрэн Лях. 2 кулі прастрэлілі яму нагу, трэцяя прайшла скрозь грудную клетку, на крык раненага Ляха выскачыла з хаты жана яго і дваюрадны брат Міхал Лях, якіх пасьля гэтага жаўнеры зьбілі прыкладамі стрэльбаў. Раненага Л. Ляха ўнясьлі ў хату, а Адама Ляха і Ю. Шэстака арыштавалі. На другі дзень арыштаваных звольнілі. У хуткім часе пасьля нападу жаўнераў на сялян в. Брыкоўшчына сьмяротна раняны Л. Лях памёр—у час падарожы да бальніцы ў Клецку.

У хуткім часе па тых выпадках „Газэта Нясьвіжская“, арган Павятовага Сойміку, паведаміла, што жаўнеры забілі аднаго бандыта і арыштавалі 2-х. Забіты жаўнерамі Л. Лях быў солтысам і праз 25 гадоў быў царкоўным старастай. Факт гэты добра характэрызуе адносіны на беларускіх землях—каждае праступленьне, зробленае мясцовай уладай, знаходзе сваё апраўданьне ў пераконываючых лёгка польскае грамадзянства аргумэнтах (даводах):—„бандыт“.

Усе мясцовыя ўлады, як роўна і польская прэса зараз-жа пасьля дакананьня праступленьня над мясцовым насяленьнем—усімі сіламі стараюцца абараніць злачынцаў — у мэтах „аховы павагі польскай улады“.

Але гэтая павага, утрымліваная гэткімі спосабамі ня прынясе пажаданых рэзультатаў для Польшчы.

Вышэйпаданы факт—зусім не адзіны ў сваім родзе: гэткім спосабам паліцыяй і войскам забіта некалькі асоб, аб якіх праступленьнях казалі папярэднія інтэрпэляцыі.

У віду вышэй прыведзенага інтэрпэлянты пытаюцца п. міністра:

1. Ці мае ён усьмірыць самаволю пагранічнай стражы, бяскарна забіваючы мясцовае насяленьне?

2. Ці мае аддоць судавым уладам жаўнероў, якія забілі солтыса Л. Ляха?

3. Ці мае пачаць справу аб прыватнае адшкадаваньне ад скарбу для сям'і забітага солтыса?

Варшава, 30/IV—1925 г.

241—Паслоў Белар. Клюбу да п. Міністра скарбу— у справе бяспраўнага налажэньня маёнткавага падатку і пабіцьця сэквэстратарам і паліцыянтам солтыса в. Грыбоўцы, гм. Галынка, Горадзен. пав.

Солтыс в. Грыбоўцы, Галын. гм., Горадзен. пав. Якаў Ігнацюк мае каля $^1/_4$ дзесяціны зямлі, але падаткавыя ўлады налажылі на яго падатак ад маёнтку ў суме 48 слотых 18 грошаў, указываючы ў „выказе“ 15 дзесяцін.

Ня глед зячы на скаргу Ігнацюка сэквэстратару Куклічу на бяспраўнае налажэньне падатку, той спагнаў з яго першую рату ў суме 9 зл. 99 гр., а так-жа на 2 наступныя раты забраў машыну, належачую да бацькі платніка Кандрата Ігнацюка, на выкуп якой бацька павінен быў заплаціць 20 зл. 94 гр. у скарбовую касу (квіт з 12/III 1925 г. № 781—051190 і 781—051191).

11-га сакавіка г. г. сэквэстратар Кукліч з паліцыянтам Рыгорам Мерняко ўскім прыбылі да вёскі Галынкі, каб сэквэстраваць маемасьць платнікаў. Па дакананьні сэквэстрацыі, урадоўцы патрэбавалі ад солтыса І. Ігнацюка, каб ён на 15-га сакавіка адабраў у сялян засэквэстраваныя каровы і даставіў іх у Галынку. Солтыс адказаў, што ён—ня ў сілах выканаць гэтага, што гэта можа зрабіць толькі паліцыя. У адказ на гэта сэквэстратар і паліцыянт пачалі біць солтыса, а калі солтыс стаў абурацца на гэтую самаволю і надужыцьце прадстаўніка ўлады, дык вышэй паказаныя ўрадоўцы далі яму яшчэ больш, дый яшчэ зрабілі пратакол на солтыса.

Сьведкамі гэтай справы былі: Язэп Ігнацюк, Аляксандар Карповіч і Пётр Карповіч—з вёскі Галынкі.

У віду вышэйпаданага інтэрпэльнты пытаюцца ў п. Міністра:

1) Ці мае ён даручыць падлеглым яму органам вярнуць Ігнацюку Якаву і Кандрату незаконна спагнаныя сумы на падатак маёнткавы?

2) Ці мае ён аддаць пад суд сэквэстратара Кукліча і паліцыянта Мерняко ўскага—за пабіцьцё солтыса пры выкананьні службовых абавязкаў.

Варшава 30/IV—1925 г.

Што „дау“ урад „Крэсам“?

(Пастановы „Крэсавай сэкцыі“, зацьверджаныя Радай Міністраў).

Рада Міністраў зацьвярдзіла наступныя пастановы „Крэсавай сэкцыі“, даручаючы адносным міністрам іх выкананьне.

I. У галіне міністэрства „зямельных рэформ“:

1) прысьпяшыць перадачу асаднікам права ўласнасьці на даныя ці праданыя ім участкі зямлі;

2) прыняць меры, каб „зямельныя ўрады“, а таксама парцэляцыйныя ўстановы шырока і заботліва трактавалі патрэбы мясцовага насяленьня;

3) разьвіць чым шырэй на абшары ўсходніх ваяводзтваў акцыю па камасацыі (сцаленьню грунтаў—шнуроў на атрубы—хутары), побач з прырэзкай зямлі да карлаватых гаспадарак (карлавыя польская літэратура лічыць гаспадаркі, маючыя **да паловы гэктара**, троха менш $^1/_2$ дзесяціны *Рэд.*),—з шырокім звальненьнем насяленьня ад аплаты гэтай камасацыйнай працы;

4) прыняць меры, каб у пляне працаў на гэты год міністэрства было выкананьне ўрадавай камасацыі ня менш, як па 20.000 гэктараў (21.800 дзесяцін) на абшары кожнага з 4 ўсходніх акружных зямельных урадаў;

5) прысьпяшыць ліквідацыю сэрвітутаў—шляхам унясеньня навэлы да закону 10/I—1922 г., даючага ўплыў зямельным урадам на прысьпяшэньне працаў палюбоўных ацэначных камісіяў і паднімаючага нормы адшкадаваньня за скасаваньне сэрвітутаў;

6) распачаць меліорацыі (палепшаньне для гаспадаркі) няўжыткаў (нягодных зямель) на абшары ўсходніх ваяводзтваў наагул, а асушэньня Палесься ў асаблівасьці (!);

7) сьціраваць на абшар усходніх ваяводзтваў парцэляцыйную дзеяльнасьць Рольнага Банку — шляхам адкрыцьця там аддзелу гэтага Банку і—купляньня ня толькі цэлых маёнткаў, але і частак іх—на мэты павялічэньня карлавых гаспадарак і мясцовых паляпшэньняў грунтаў.

II. У галіне міністэрства асьветы і рэлігіі:

1) пачынаючы ад новага школьнага году, увясьці ў пачаткавых школах —згодна з жаданьнямі бацькоў (?) выкладаньня навукі ў **двух мовах**;

2) увясьці—на абшарах, населенных літвінамі,—дзяржаўныя пачаткавыя школы—з выкладовай мовай літоўскай;

3) стварэньне ў найбліжэйшым часе (?) курсаў: адных у Вільні, другіх у Кракаве — для вучыцялёў беларускай і польскай нацыянальнасьці, для падгатоўкі іх для выкладаньня ў двуязычных школах—польска-беларускіх;

4) выдаць—коштам міністэрства—беларускага лемэнтара і беларускага „чытаньня“—перад пачаткам школьнага году;

5) выданьне коштам міністэрства—у працягу 1925—1926 школьнага году далейшых беларускіх падручнікаў для пачатковых двуязычных школаў, а таксама для сярэдніх школаў беларускіх ці двуязычных;

6) выдаць коштам міністэрства — у працягу 1925—6 школьнага году „рускія“ (украінскія!) падручнікі для пачатковых школаў „рускіх“ (украінскіх!) і двуязычных;

7) безадкладна ўтварыць матуральныя экзаменацыйныя камісіі: украінскія, беларускія, літоўскія і расейскія—для скончыўшых прыватныя гімназіі з адпаведнай выкладовай мовай;

8) увясьці з новага школьнага году абавязкавае навучаньне беларускай мовы ў вучыцельскія сэмінарыі віленскага і навагрудзкага ваяводзтваў;

9) устанавіць у працягу 1925—27 г. г. школьныя абводы (участкі) і школьную сець—у ваяводзтвах віленскім, навагрудзкім, палескім і валынскімі;

10) стварыць у працягу 1925—26 г. двуязычную вучыцельскую сэмінарыю на Валыні;

11) унясьці ў працягу месяца ў Раду Міністраў праект статуту праваслаўнай царквы ў Польшчы;

12) аднавіць кафэдру „рускай“ (украінскай) літэратуры ў Ягелонскім Унівэрсытэце і

13) стварыць „studium Slavium“ (славянскі інстытут?) у Кракаве.

Іншыя і наступныя пастановы „сэкцыі“ па меры іх зацьвярджэньня Радай Міністраў будуць паданы да ведама ў свой час.

Як загарахтаваны „пактам бясьпечнасьці“ франка-нямецкая і польска-нямецкая граніцы.

Як заявілі абодва міністры—Брыян і Чэмбэрлен—яны дайшлі да поўнага паразуменьня — па ўсім пунктам — у справе знамянітай прапазіцыі нямецкага ўраду а „забясьпечываючым мір пакце“. Вельмі цікавы і важны зьмест гэтага паразуменьня. Пакт будзе падпісаны Англіяй, Францыяй, Бэльгіяй і Нямеччынай, пакінута мейсца для Італіі.

Пакт гарантуе толькі заходнія граніцы Нямеччыны (з Францыяй і Бэльгіяй), гэтая гарантыя накладае на Англію неадкладна і бязумоўна аружна выступіць на абарону гэтых граніц, калі Нямеччына сама нападзе на Францыю ці на Бэльгію (не справакаваная гэтымі дзяржавамі!). Што датычыць усходняй граніцы Нямеччыны (з Польшчай і Чэхаславакіяй), дык гэтыя граніцы застаюцца пад аховай Лігі Народаў, статут якой Англія яшчэ раз пацьвярджае з усей сілай... Дык перад усім вялізарнае значэньне мае самы факт фактычнай і міжнародна-юрыдычнай розьніцы, якую зрабіў пакт з (4) вялікіх дзяржаў — паміж граніцай заходня-нямецкай і ўсходня-нямецкай,—паміж нямецкай граніцай з Францыяй і нямецкай гранізПольшчай і (Чэхаславакіяй).

Але трэба прыгледзіцца бліжэй да зьместу гэтай прынцыповай розьніцы. Калі Нямеччына парушыць сваю заходнюю граніцу, дык, апрача Францыі і Бэльгіі, аўтаматычна мае перад сабой усю ваенную моц і Англія. А калі Нямеччына парушыць сваю ўсходнюю граніцу, дык пачнуць дзеяць адносныя §§ статуту Лігі Народаў, паводле якіх усе сябры Лігі абавязаны прыйсьці на помач заатакаванаму сябру. Каб пусьціць у ход і арганізаваць гэтую агульную, ці спэцыяльна даручаную тым ці іншым сябрам Лігі абарону, павінна сабрацца Рада Лігі Народаў.

Рада Лігі Народаў павінна аднагалосна бяз учасьця заінтэрасаваных сяброў пастанавіць аб распачацьці акцыі проці напаўшага. Дык перад тым яшчэ і выясьніўшы хто ў запраўднасьці зьяўляецца напаўшым.

Рада Лігі можа тады даручыць, ці дазволіць Францыі прайсьці праз дэмілітарызаваны пас удоўж Рэйну... Калі Францыя, не чакаючы дазволу, пагвалціць гэты пас самавольна, дык адразу пакт і статут Лігі—трацiць на гэты выпадак вайны ўсю сваю сілу... Тады ужо і навет калі Нямеччына, як ужо „справакаваная“ Францыяй, сама нарушыла-б сваю граніцу з Францыя і пашла-б праз „цывілізаваную“ лінію Рэйну—біць французаў, дык з гэтага ўсяго ўжо ніякога абавязку ўмяшацца ў вайну з боку Англіі ня было-б... Нямеччына, Францыя і Польшча тады былі-бы прадастаўлены самі сабе шукаць сабе саюзьнікаў і... ворагаў, паміма Англіі.

Вось, у чым вельмі важная па сутнасьці розьніца між нямецка-францускай і нямецка-польскай граніцамі, як яны ўстаноўлена новым, маючым быць у хуткім часе падпісаным пакце між Англіяй, Францыяй, Бэльгіяй і Нямеччынай і, магчыма—Італіяй.

Прынамсь—роль Англіі гэтым пактам высьветлена і азначана дакладна даканца і зьменам ужо не падлягае.

Можна сказаць—на пацяшэньне Польшчы,—што яе саюзьніца рабіла і зробіла, што магла... Не магла, зразумела, толькі змусіць Англію — каб тая налажыла сабе вяроўку на шыю за ўсе тое, што Францыя нарабіла ў Вэрсалі...

Новыя правакацыі у Кітаі.

Дапраўды —

Усё тое, што згалелая, здурнелая, а перад усім дарэшты маральна збанкрутаваная ў самазабойчай вайне—імпэрыялістычная Эўропа выробляе надалей над тымі „каляровымі кантындэнтамі“, якія яна лічыць так ці інакш сваей уласнасьцю, ня можа быць названа інакш, як правакаваньнем страшэннага выбуху з аднаго боку і—самагубствам вар'ята, з другога.

Толькі здалеў больш-менш Кітай неяк злагодзіць тэй-жа Эўропай выклікацую і падтрымліваную хатнюю братазабойчую вайну, заняўшыся наадварот — у паразуменьні з Расеяй вялікай акцыяй дзяржаўнага аб'яднаньня і вызваленьня з-пад ярма эўрапэйцаў, як гэтыя апошнія ізноў знайшлі повад выклікаць новы ўзрыў ненавісьці ў Кітаі, аб'яднаўшы ўвесь край і новую пагрозу крывавай сутычкі на Усходзе.

Асяродкам крывавых падзеяў ізноў аказаўся Шанхай. Гэтае кітайскае места даўно настолькі апанавана чужынцамі, што падзелена навет на 3 часьці, з якіх адна з'яўляецца чыста францускай, другая англа-амэрыканскай, а толькі трэцяя—кітайскай.

Уся кітайская бяда найляпей адбіваецца ў абразе гэтага места: чужацкая часьць места—тых паразітаў, што жывуць на целе кітайскага народу і яго ўласнага краю, карыстаючыся працай яго рук,—аж трэскаюцца з надмеру багацьця і раскошы; а толькі дзяльніца самага гаспадара краю, самага кітайскага работніка, што стварае сваей працай гэтае багацьцё чужынцам,—паражае нуждой і ўбожствам... Добра ведамы і нам беларусам абраз краю, у якім пануе чужынец... Але — што не заўсёды будзе так, ужо пачулі ясна — абодва ворагі...

Але лятуцяць яшчэ імпэрыялісты... у Кітаі, што жалезам і крывёй здалеюць яны змусіць да далейшай пакоры паняволеных гаспадароў краю.

Дык вось, што здарылася ў Шанхаю.

На японскіх фабрыках у Шанхаі выбухла забастоўка. Японскія прамыслоўцы зрабілі спробу задушыць забастоўку сілай. Некалькі работнікаў было ранена. Гэта выклікала абурэньне сярод кітайскага грамадзянства і найбольш шляхотная яго частка — студэнцкая моладзь—зрабіла на вуліцах Шанхаю вялікую дэманстрацыю проці насільства чужаземцаў. Чужаземская паліцыя, баронячая, як паўсюдых, інтэрэсы капіталістаў, і здэмаралізаваная тут ня менш, чым дзе інш, пачала стрэляніну, навет без папярэджаньня, — забіла 11 чалавек і зраніла 16, каля 40 арыштавала. Праз дзень ізноў забіта 3 студэнты, ранена 17. Па ўсім краю гэтая разьня безбаронных выклікала страшэннае абурэньне. Абвешчана была агульная забастоўка ў Шанхаі, якая перакінулася ў іншыя месты. Па ўсім Кітаі пачаліся варожыя сутычкі з чужакамі.

Кітайскі ўрад заявіў прадстаўнікам дзяржаў рашучы пратэст проці паводзеньня іхняй паліцыі ў Шанхаі і патрэбаваў звальненя арыштаваных.

Але гэтыя паны-каты, самі справакаваўшыя ўсё здарэньне, самі-ж пачуліся пакрыўджанымі і пачалі рыхтавацца да „карацельнай экспэдыцыі“—на „ўсьмірэньне“ непакорнага краю... Ізноў, як паўгода таму, у Шанхай пачалі пасылаць крэйсары з войскам Японія, Англія, Францыя. Толькі Амэрыка неяк прызнала крыўду Кітаю, але — больш у піку сваей канкурэнткі Японіі...

Самі амэрыканцы заявілі голасна (ў піку-ж Японіі), што прычына ўсіх разрухаў у Кітаі — тая, што эўрапэйцы (і амэрыканцы таксама-ж!), карыстаючыся з нагоднасьці і мілітарнай слабасьці кітайцаў, захапілі ў працягу апошніх 30—50 гадоў ня толькі ўсе жалезныя шляхі ў Кітаі, але і найлепшыя яго натуральныя багацьці. І вось з-за гэтых усіх „канцэсіяў“ і ідзе страшэнная барацьба і канкурэнцыя дзяржаў, якія хаця інтрыгуюць адна проці аднэй, але разам трымаюцца, як толькі кітайскі народ прабуе вызваліцца ад гэтых жываедаў-эксплёататараў...

Ядуць папросту жыўцом, грызучыся друг з другам, гэтыя жываеды-імпэрыялісты кітайскі народ і яго ўласны край, набіваючы сабе кішані... Дык дзіва, што расьце, неабмяжована расьце слушная і сьвятая ненавісьць ахвяры да гэтага ката „вышэйшай культуры“, які мае на мэце ня гэтую культуру а толькі ўласную карысьць.

І вось цяпер, трэба сцьвярдзіць гэта, нашы кітайскія браты паразумнелі ўжо і памацнелі да таго, што пачалі ўжо ставіць апор гэтым жываедам, паставіўшы і агульную задачу сабе—вызваленьня з пад іх ганебнай няволі...

Цяжкі і доўгі шлях гэтай вызваленчай акцыі, але няма той сілы на сьвеце, якая-б яе спыніла, раз яна пачалася.

А кожны лёгка зразумее, якога кіраўніка, таварыша і памоцніка мае кітайскі народ у гэтай сваей акцыі ў асобе братняга і суседняга народа—расейскага, — а перад усім — заклятага ворага імпэрыялістаў усіх краёў—Радавага ўраду.

Важнейшыя здарэньні.

У Польшчы.

Адстаўка міністра Ратайскага.

„Gaz. Porannа“ (эндэцкая) паведаміла раней усіх, аб тым, што мін. унутраных спраў Ратайскі падаў у адстаўку, і адстаўка прынята — пасьля канфэрэнцыі п. Прэзыдэнта з п. прэм'ерам. На тэй-жа канфэрэнцыі пастаноўлена назначыць міністрам унутраных спраў п. Романа, былага Дэлегата ў Вільні. „Правая рука“ (prawica) міністра Ратайскага—яго віцэ-міністар Смульскі таксама „сам хоча ўхіліцца ад улады“...

Але апошняя вестка такая, што навет пан Роман „за левы“ на міністра ў габінэт пана Грабскага. Усплыла кандыдатура: сэнатара Кашніца. Вось той дык, відаць, наварыць кашы. Але хто будзе расхлёбываць?..

Флірт польскіх міністраў з жыдоўскімі пасламі.

Ужо даўно польскі ўрад імкнецца раскалоць опазыцыйна аб'яднаныя нацыянальныя меншасьці (бо б'юць „аб'ядвана“ ўсіх!). Заўсёды танней выйдзе —даць аднаму, як даць усім... Дык вось, выбраўшы найбольш здатных да торгу — жыдоў, урад здалеў—за „юдавы канцэсіі“—часамі купляць галасы, ці маўчаньне іх паслоў. Так было, напрыклад, з „Конкордатам“.

Цяпер, з аднаго боку, — на носі сэсія Рады Лігі, у якой „сусьветныя жыды“ быццам маюць вялікія ўплывы, а ў якой будзе вырашацца справа польска-данцыгскага спору;—з другой — найбольш непрымірымы з жыдоўскіх паслоў Грюнбаўм выйшаў з жыдоўскага кола, ці навет з Сойму. — Дык вось, польскі ўрад ізноў пачаў фліртавацьз жыдамі, абяцаючы за „маральнае“ падтрыманьне— розныя „матэр'яльныя“ рэчы...

Дык 9/VI — адбылася ў прыватных пакоях мін. Скшыньскага канфэрэнцыя міністраў замежных спраў Скшыньскага і мін. асьветы Грабскага з пасламі Рэйхам і Жонам—у мэтах „урэгуляваньня польска-жыдоўскага сужыцьця“. Гэтае „сужыцьцё з жыдамі“, замест праектаванага (!) п. Тугуттам „сужыцьця з беларусамі і ўкраінцамі“, адразу востра высунуў, увайшоўшы ў „Крэсавую сэкцыю“ п. Ст. Грабскі. Рэзультатам сутычкі абодвух п. п. Станіславаў,—калісьці—супольных айцоў неданошага байстручка—„Закону 31/VII — аб мовах на Крэсах“ (lex Stanislawia) — і была перамога пана Грабскага, паражэньне і адстаўка п. Тугутта.

Амэрыканская пазыка.

Газэты пішуць. — У Варшаву мае прыехаць п. Діллён прадстаўнік тых амэрыканскіх фінансістаў, якія далі Польшчы пазыку ў 50 мільёнаў даляраў. Дык п. Діллён мае абгаварыць асабіста варункі, на якіх будзе выплачана Польшчы астаўшаяся сума ў 15 мільёнаў. Нешта дзіўна: ці-ж агульныя варункі пазыкі маюць зьмяніцца цяпер на гэтыя 15 мільёнаў?—Можа — у зьвязку з тым, што амэрыканская пазыка, як прызнаўся прэм'ер Грабскі, пайшла не на тое, на што бажыліся яе пусьціць пры яе падпісаньні?—не на будаваньне краю, а на... „апэльсіны“?!.

З'езд вайсковых асаднікаў.

У пачатку чэрвеня ў Варшаве адбыўся з'езд вайсковых асаднікаў.

Галоўнай тэмай моваў і абрадаў асаднікаў быў пратэст проці пастановы сучаснага Сойму, які з увагі на становішча беларускіх і ўкраінскіх паслоў прыпыніў далейшае выкананьне закону 17/XII—1920 г. аб асадніцтве, у рэзультаце чаго „3,390.000 маючых права на зямлю, атрымала толькі нязначная частка—8,000“.

(Можам ад сябе падаць больш точныя лічбы: з 99.513 падаўшых заяву, прызнана ўжо права — 22.503, атрымалі зямлю 8.732... — Дык ім і гэтага яшчэ мала!).

Сярод масы прывітаньняў і прамоваў, асаблівую ўвагу зьвярнула прамова пасла Маліноўскага, „аднаго з айцоў закона аб асадніцтве (ёсьць 2 паслы Маліноўскіх—пэпээсавец і вызваленец,—дык які з іх—бацька асаднікаў?).

Усе прамоўцы „падносілі вялікую роль вайсковых асадаў, гэтых рассаднікаў польскай культуры на Крэсах Рэчыпаспалітай“.—Аб гэтай „культуры“ шмат цікавага якраз і кажуць—штодзенна па некалькі інтэрпэляцыі нашых і ўкраінскіх паслоў...

Але „нячуваную буру радасьці і захопленьня“ выклікала паяўленьне на з'езьдзе запраўднага бацькі асадніцтва і самога „першага асадніка Польскай Рэспублікі“—Марш. Язэпа Пілсудскага. Усе асаднікі, зразумела, казалі толькі адно: давай яшчэ зямлі, яшчэ палёгкаў, яшчэ грошаў“...

Раскрыцьце вялікай шпіёнскай арганізацыі ў Варшаве.

Тэлеграма з Варшавы кажа, што там раскрыта вялікая шпіёнская арганізацыя, якая зьвязана з адным з пасольстваў заграмічных дзяржаў. На чале арганізацыі стаялі служачыя ў пасольстве Балашова і Зубкоў, якія арыштаваны. Дакуманты, знойдзеныя ў іх, кампрамітуюць шмат асобаў, навет—„з польскімі прозьвішчамі... — Што гэта за „дзяржава“, тэлеграма ня кажа, але можна спадзявацца вострага дыплёматычнага канфлікту.

„Рэха“ справы Траяноўскага.

„Kur. Wil.“ паведамляе, што сьледзтва ў справе выбуху бомбы ў кватэры „рэдактара“ „Walki Ludu“ і правакатара Траяноўскага—закончана. Што датычыць падаўшага тады — пасьля рэвэляцыяў аб учасьці ў гэтым выбуху варшаўскай палітычнай паліцыі—кіраўніка яе экспазытуры Пёнткевіча, дык ён, як прадбачыў п. Тугутт, ужо атрымаў, замест „kratek“, вышэйшую пасаду пана інспэктара ў Паморскім ваяводзтве.

Забурэньні ў лодзкім вастрозе.

„Рэчпосполіта“ даносіць, зразумела, „пасваёму“ аб здарэньнях у турме ў Лодзі.

У аддзеле, дзе трымаліся камуністы, выбухла забурэньне. Камуністы, скаржачыся на зьверскае абыходжаньне з імі дазорцаў, пачалі страшэнна галасаваць і біць чым папала ў дзьверы камераў. Адзін адзіночны навет кінуўся на увайшоўшага да яго дазорцу і зраніў яго. Тады адміністрацыя выклікала паліцыю, якая і „przywróciła porządek“...

„У нашых вастрогах — усё горай“, сьцьвярдзіў—пасьля адстаўкі п. Тугутт.

Галадоўка ў беластоцкім вастрозе.

„Усходняе Агенства“ даносіць, што ў беластоцкай турме выбухла галадоўка сярод палітычных вязьняў. Прычынай галадоўкі была адмова адміністрацыі злагодзіць жорсткі рэжым вастрогу, як гэтага дамагаліся вязьні. У справу ўжо ўмяшаўся беластоцкі пракурор, але што ён захоча зрабіць няведама.

Чытайце і пашырайце сваю беларускую газэту

Прачытаўшы, аддай другому!

Напады і замахі.

Новы вялікі замах на „Крэсах“.

8/VI усю Варшаву абегла вестка аб новым вялікім нападзе на „Крэсах“ на цягнік, які быццам быў навет узарваны ў паветра...

Але пасьля выясьнілася, што быў вялікі напад, але не на цягнік, а на двор „Корніцы“, у Лыскаўскай гміне, Ваўкавыскага павету.

Банда ў 50 азброеных у рэвальвэры і кулямёты (расейскія) чалавек, апранутых у расейскія „гімнасьцёркі“, напала на дом, забіла ў ім арэндара і яго гаспадыню; зрабавала ўсё, што было, падпаліўшы двор... Калі на страляніну і від агня пачалі шыкавацца і падыходзіць атрады паліцыі і войска, бандыты—у поўным баявым парадку — адыйшлі ў напрамку „Новага Двору“, дзе і зьніклі па лясох і балотах.

Паліцыя думае, што разам з войскам і прыбываючай аж з Варшавы пэдмогай (!!) яна здалее акружыць і вылавіць банду... „Dz. Wil.“

Яшчэ фальшывая паніка ў Варшаве.

6/VI вечарам уся Варшава была ў паніцы з прычыны пушчанай газэтамі весткі аб тым, быццам у Нараградчыне ўзарваны чыгункові мост і разьбіліся аж 3 цягнікі... Весткі аказаліся фальшывымі... Але цікава гэтая характэрная для нячыстага сумленьня лёгкасьць веры і хуткасьць панікі... Не дарма-ж казаў аб бандытах п. Тугутт, што толькі яны змушаюць Варшаву да рэформаў і палёгкаў для „Крэсаў“...

Спроба замаху на цягнік.

На рэльсы вузка-калейкі Браслаў—Опсы няведамыя замахоўцы—на 60 вярсьце ад Браслава—наклалі шпалаў. Але цягнік на ўсім хаду скінуў сам шпалы і прыйшоў цэлым на станцыю.

„Разьбіткі дывэрсыйнай банды ў Віленшчыне“.

„Dz. Wil.“ дае дзіўныя весткі аб „разьбітках дывэрсыйнай банды“, якая зрабіла няўдалую спробу нападу на цягнік між Сьвіслачай і Нарэўкай. Банда рассыпалася на дробныя групкі, з якіх адна ў 6 чалавек навет прайшла праз Рудніцкую Пушчу пад Вільню і далей на Немянчын. „Бандыты зусім вычарпаны, галодныя, босыя, абдзёртыя, але... маюць яшчэ вялікі запас куляў і расейскіх карабінаў... Гавораць між сабой выключна (!) парасейску. Улады Віленска-Троцкага павету наладзілі на іх аблаву“.

Вось, што піша наіўная газэта. — Калі навет супрацоўнікі віленскай газэты так добра бачылі і так зблізка чулі гэтых 6 бандытаў, што ведаюць, як яны абуты (!) і апрануты, сколькі ў іх куляў і як яны гавораць паміж сабой, дык, дапраўды, дзіўна, на што яшчэ ўладам ладзіць на гэтых 6 вычарпаных чалавек вялікія аблавы... Ці-ж, дапраўды, так страшыць „wiekszy zapas kul i krótkie karabiny rosyjskie“... у руках 6 зморaных людзей, што яны маглі прайсьці ад Ваўкавыска аж да Немянчына—на віду і на слуху ўсіх „супрацоўнікаў“ і карэспандэнтаў „Dz. Wil.“, якіх на „Крэсах“ — тысячы?!.

А хтось казаў, што р. Obst—зусім ня дурны чалавек; бяда толькі, што—і не разумны...

Заграніцай.

Вайна ў Марокко.

Апошнія „пабеды“ францускіх войскаў, у выніках прышлося ачысьціць цэлы рад пагранічных украпленьняў, змусілі Францыю да „рашучых мераў“ — у саюзе з сваей калегай па ваенным пасьпехам у Афрыцы—Гішпаніяй.

На сколькі палажэньне ў Марокко непакоіць Францыю, відаць з таго, што 9/VI туды — на тэатар вайны едзе сам прэм'ер Пэнлевэ.

П. Пэнлевэ навет ня едзе, а—ляціць... на аэраплянe праз Гішпанію. На мейсцы — у Рабаце, дзе — галоўны штаб франц. арміі, адбудзецца нарада прэм'ера з маршалам Ліоті, пасьля чаго п. Пэнлевэ праедзе ў працягу 4 дзён па ўсяму (?) фронту.

З Фэца афіцыяльна паведамляюць, што ў віду атакаў рыфэнаў на Бібанэ, францускія войскі адступілі, узарваўшы ўрадовыя ўстановы і склады.

Ці ўжо не пачатак рэвалюцыі ў Баўгарыі.

Як можна было прадбачыць, ніякім белым тэрорам, ніякімі судамі, казьнямі, павальнымі обыскамі і аблавамі—не здалее ўрад Цанкова задушыць і змусіць да пакоры да канца варожае яму баўгарскае сялянства, якога аж 85% усяго насяленьня краю!

Арганізаваныя судовыя і паліцэйскія забойствы з боку ўраду толькі пашыраюць і паглыбляюць рэвалюцыйны рух у краі. Апошнія весткі кажуць ўжо аб запраўдным бai 9/VI на вуліцах Софіі, у якім было забіта аж 68 чалавек (лічба пададаная ўрадам!). Аб заценласьці гэтай барацьбы—дый не з камуністамі, але з сялянскім масівам краю!—сьведчыць факт, што па загаду ўраду быў у часе баёў узарваны ў паветра дом пасла сялянскай партыі.

Патройны замах на гішпанскага караля.

На гішпанскага караля Альфонса XIII распачалася запраўднае паляваньне.

Першы замах меў быць выкананы ў цягніку, у якім ехаў кароль з каралевай — у часе праезду праз тунэль пад Барцэлонай. Паліцыя знайшла прырыхтаваную бомбу ў 80 кіляграмаў вагі. Арыштавана шмат студэнтаў і ўрадоўцаў — сяброў „арганізацыі“ „Незалежнай Каталёніі“ („ваяводзтва ў Гішпаніі“).

Другі замах быў арганізаваны — папрыкладу баўгарскага—у касьцёле, дзе мела быць вялікая імша ў прысутнасьці караля. Замахоўцамі аказаліся, прынамсь арыштаваны — 4 ксяндзы (дык ці-ж і ксяндзы, дый у Гішпаніі! ужо—камуністы!!).

Трэці замах быў арганізаваны—пры выезьдзе караля з тэатру. На аўтамабіль караля і яго сьвіты меў наехаць вагон трамваю, а ў часе паўстаўшай суматохі мелі забіць караля. Але трамвай наехаў на аўтамабіль паліцэйскай ахраны і кароль астаўся цэлы. Навакол мейсца замаху ў дамох вобыскі адкрылі шмат аружжа і гранатаў. Адначасна па ўсім месьце Барцэлоне кінута шмат бомбаў. „Будуйце вашыя палацы на вулканах“, радзіў нямецкі „антыхрыст“—Ніцшэ. Дык—ці-ж толькі ў Гішпаніі слухаюць яго рады!?

Сэсія Рады Лігі Народаў.

8-га чэрвеня адбылося першае паседжаньне Сэсіі Рады Лігі Народаў. Першай справай павесткі быў даклад прадстаўніка Бразыліі Мелло-Франка—у справе атрыманьня польскага „абыватэльства“ для немцаў у Польшчы.

Рада зацьвярдзіла тую ўмову, якую — у справе гэтага спору заключылі нямецкі і польскі ўрады на канфэрэнцыі ў Вене 30/VIII 1924 г.

Хроніка.

Забойства польскага ксяндза. У м. Віцхолянах 8/VI забіты ксендз Грондзкі, кіраўнік закладу для непаўналетніх праступнікаў. Забіў ксяндза эканом закладу—быццам (як піша „Dz. Wli.“) за раскрыцьце яго надужыцьцяў. Ксендз Грондзкі—ведамы „прыхільнік польска-літоўскага парузуменьня“, (?) за што яго ненавідзелі літоўцы, трымалі ў вастрозе ў 1919 г. ў Коўні, а пасьля выселілі з Літвы зусім. „Dz. Wil.“.

З'езд крэсавых пястоўцаў у Вільні. 14/VI ў салі „Лютня“ адбудзецца акружны з'езд пястоўцаў. На з'езд мае прыехаць і сам п. Вітас, які зробіць даклад аб сучасным палажэньні палітычным і аб бягучых патрэбах вёскі (?— чытай — асаднікаў)...

Важны пачын ураду ССРР. „Роста“ даносіць, што ўрад ССРР зьвярнуўся да польскага міністэрства чыгункі с прапазыцяй — склікаць у ліпні г. г. ў Маскве першую (за 6 гадоў!) польска-савецкую канфэрэнцыю ў справах чыгункавай камунікацыі.

Наваградзкае ваяводзтва. Урад пастанавіў утрымаць Наваградзкае ваяводзтва надалей. Але сучасны ваявода гэнарал Янушайтіс, які выкліканы ў Варшаву і, ужо больш ня вернецца ў Наваградак, вернецца ў армію. — Яго баўгарскія „стратэгічныя“ аблавы на людзей, яго арышты — зараз ня менш як тысячамі!—„бандытаў“ паказалі, што навет у Польшчы, навет на яе „Крэсах“ гэты „гарачы не па розуму“ ваяка — сеў ці пасаджаны не на свае мейсца.

Камуністычныя адозвы. У працягу ўчарашніх сутак, як павед. „Dz. Wil.“, 11/VI знойдзены камуністычныя праклямацыі, якія былі раскіданы па вул.: Славацкага, Перамонце, Львоўскай, а так-же на падворку гімназіі імені Лелевеля.

Адозвы былі надрукованы на мовах: польскай і беларускай.

Граната на чыгунцы пад Баранавічамі. Учора, як падае „Dz. Wil.“, у часе абходу чыгункавай лініі ў блізі ст. Баранавіч паліцыянтам калеёвым заўважана граната, якая была паложана на рэльсы. Граната, як піша польская газэта, мела-б страшэнную сілу ў час яе выбуху.

Забойства.

(*Вялейскага пав.*).

Прапазіцыя Паслоў Беларускага Клюбу—у справе забіцьця Антона Вайтовіча, дзікага катаваньня б. вучыцеля Сільвэстра Беганскага і іншых сялян, якія зроблены і робяцца пагранічнікамі і вывядоўцамі паліцыі.

Цяжка сабе прадставіць, каб культура XX веку магла прынясьці з сабой тое, што робіцца на беларускіх землях у Польшчы. У працягу 4 гадоў беларускае насяленьне было аддадзена на ..... паліцыі.

Ад паўгоду на помач паліцыі прышла пагранічная стража, якая ў сваіх катаваньнях перагняла сваіх папярэднікаў, і стала чымсь, што ўжо перакрачае чалавечае паняцьце: стварыла яна запраўдную галгофу для сялянскіх беларускіх масаў.

На абшары некалькіх сотняў кілямэтраў—шырскім пасам удоўж граніцы—адбываюцца масавыя арышты і масавае катаваньне сялян. Катаваньне гэта зайшло так далёка, што сержанты і жаўнеры 10 баону гранічнай стражы ў м. Красным, Вялейскага павету замучылі на сьмерць селяніна Антона Вайтовіча з в. Сычэвічы, Радашкоўскай гміны.

У канцы студня г. г. жаўнерамі 10 баону гранічнай стражы быў арыштаваны Антоні Вайтовіч, селянін в. Сычавічы, Радашк. гм., Вялейскага пав.

Арыштаваны быў адасланы на пастарунак 10 баону гранічнай стражы ў м. Краснае, дзе жаўнеры дапусьцілі да нячуванага навет у гісторыі катаваньня пануючымі ўладамі насяленьня—забойства гэтага чалавека.

Дапрос арыштаванага быў прыкладам дзікага глумленьня пагранічнікаў—у мундзірах польскага жаўнера—над безбаронным зьвязаным чалавекам.

Яму зроблены 35 цяжкіх ран, жывому чалавеку пускалі кроў, білі і катавалі яго, пакуль няшчасны не сканаў у руках катаў. Перастрашаныя рэзультатам свайго „дапросу“, жаўнеры аддалі ўжо пахаладзеўшы труп акалічным сялянам на пахаваньне.

Зробленыя — агляд і ўскрыцьце трупа ўстанавілі 35 ранаў, зробленых гранічнікамі Вайтовічу.

Жонка Вайтовіча не магла пераўжыць такога ганебнага забойства мужа і з гора памёрла 8-га лютага г. г., пакінуўшы сіротамі 2 дзяцей.

Каб мець поўнае паняцьце аб спосабах катаваньня, тасаваных 10 баонам гранічнай стражы, якія ў канцы канцоў прывялі да забойства чававека, пяройдзем да другога факту, дзе ахвярай быў былы вучыцель Сільвэстар Беганскі, які астаўся жывым—ня гледзячы на ўсе зробленыя яму зьдзекі, пыткі і мучэньні.

Карэспандэнцыі.

„Ідэйны самаўрад“.

(*Гм. Гарадоцкая, Вялейскі пав.*).

Цікавы самаўрад пануе ў нашай гміне. Каб было ясьней, як ён стварыўся, трэба пачаць аж ад выбараў. Кіраўніцтва выбарамі Вялейскім старостай было даручана абшарніку Канаржэўскаму, які пастараўся добра на „korzyść ojczyzny“. На падставе нейкае ўставы „wykreślił“ з 150 выбаршчыкаў 10 проц. разбітнейшых грамадзян і правёў выбары, як хацелася паном. У гміную раду ўвайшлі выключна шляхцюкі і панскія падлізьнікі беларусы. Войтам быў выбраны панок Шымкевіч, які аб'явіў сябе старшыней рады і ўрадаваў паўтара года, так каб ня скрыўдзіць абшарнікаў і „сваей“—шляхты. Падаткаў і ўсякіх павіннасьцяў грамадзянам дасталася львіная доля. Вясной 1923 году Шымкевіч чамусьці быў не пажаданы і староста назначыў войтам другога панка — Корсака, які скора пазнаёміўся з сваімі абавязкамі. Як сьнег на галаву, сыплюцца падаткі, з такім расчотам, каб грамадзяне, маючыя зямлі ў 5 — 10 разоў меней, як абшарнікі і шляхта плацілі ў 5—10 разоў болей за іх. Апроч войта і яго замясьціцеля, працуе аж 4-х „штатных“ пісараў дзеля спагону падаткаў і штрафаў, бо другой работы няма ніякае, калі ня лічыць завярэньня подпісаў у значнейшае меры за плату. Стогнуць грамадзяне пад цяжарам падаткаў і платы за прадажную скаціну. Калі хто мае прадаць каня, плаціць 4 зл., за торг, карову, свіньню 2—3 зл. і г. д. Добра яшчэ, калі ўдасца зараз прадаць, а то нярэдка прыходзіцца палову вартасьці жывёлы аддаць у гміну. А куды ідуць гэтыя грошы? Хто іх ведае, бо рэвізыйнае камісіі над „панскім самаўрадам“ няма. „Было, было ды і завяршылася“. Кажуць грамадзяне, чуючы, што робіць войт сёлета. Купіў стары аўтамабіль за 1.000 даляраў і аддаў яго ў рапарацыю, якая хто ведае сколькі будзе каштаваць. Купляе двое коней для выездаў па падаткі з выгацнымі паяздамі, бо грамадзянскія „bardzo niewygodny“. Шофэр згоджаны за 600 руб. золатам у год. І ўсё гэта, апроч утрыманьня гміны, школ, дарог, павятовых соймікаў і чорт ведае чаго ляжа цяжарам на грамадзян, бо плаціць не ад дзесяціны, а ад каня, ня гледзячы на тое, што найменей 20 проц. грамадзян ужо бяз хлеба. Думалася, што пасьля выбараў, якія, казалі, будуць праз кожныя тры гады, хоць трохі будзе іначай, бо грамадзяне паразумнелі і паном Каржэўскім было-б цяжэй кіраваць выбарамі і баламуціць грамадзян, як гэта было тры гады таму назад. Але дзе там! Відаць, польскаму ўраду падабаюцца гэтакія „samarządy“, бо перавыбары, як відаць з газэт, будуць толькі ў „swiętym królewstwe“, а нашы грэшныя Крэсы яшчэ не дасьпелі да перавыбараў. У астатні час паны сталі „лепшыя“. Спракудзіўся заступнік войта панок Скавінскі. Шукалі, шукалі другога панка, але ў нас іх мала. Прышлося выбраць беларуса, якога староста сцьвярджаў аж чатыры месяцы. Але яму далі добрую работу: езьдзіць з пісарам па вёсках і агрызацца з людзьмі пры спагоне падаткаў, якія спаганяюцца вельмі шпарка. Калі хто ня мае чым плаціць, дык адбіраецца астатняя вопратка. У вёсцы Кулелі забралі пяць кажухоў. Няведама, куды трэба жаліцца на гэтакае бяспраўе, пэўне-ж не ў старостві, бо на скаргі грамадзян у свой час аб неправільнасьці выбараў не зьвярталася ніякае ўвагі. Можа, хоць урэшце Беларускі Пасольскі Клюб зьверне ўвагу на нашу гміну і прадпрыме мажлівыя крокі дзеля выратаваньня грамадзян гміны з невынасімага становішча.

Пакрыўджаны.

Рэдактар-Выдавец: **М. Гэрмановіч.**

Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.